*Д. А. Доўгаль*
Рэспубліка Беларусь, Магілёў

УДК 373.5.016:81.161.3

# ПРЫЁМЫ СТВАРЭННЯ КАМПЕТЭНТНАСНА АРЫЕНТАВАНЫХ ЗАДАННЯЎ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

*У артыкуле раскрываюцца прыёмы стварэння кампетэнтнасна арыентаваных заданняў, якія выкарыстоўваюцца для правядзення розных тураў рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура», з улікам спецыфікі дадзенага адукацыйнага мерапрыемства.*

*Ключавыя словы: кампетэнтнасна арыентаваныя заданні, прыёмы стварэння кампетэнтнасна арыентаваных заданняў, комплексная работа, водгук на мастацкі твор.*

Прадметныя алімпіяды – адукацыйныя мерапрыемствы, якія з'яўляюцца эфектыўнай формай пазакласнай работы з адоранымі і высокаматываванымі вучнямі. Укараненне ў практыку кампетэнтнаснага падыходу, які мае на мэце фарміраванне ў вучняў функцыянальнай пісьменнасці, г. зн. здольнасці выкарыстоўваць набытыя веды



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і навыкі для рашэння жыццёвых задач у розных сферах чалавечай дзейнасці, прывяло да ўвядзення ў змест алімпіядных работ кампетэнтнасна арыентаваных заданняў (далей – КАЗ), пад якімі разумеюцца «спецыяльна створаныя дыдактычныя канструкцыі, якія выкарыстоўваюцца для фарміравання і праверкі ўзроўню прадметных, міжпрадметных і ключавых кампетэнцый» [6, с. 7]. Паказчыкамі (прыкметамі) такіх заданняў, па меркаванні даследчыкаў, выступаюць «кантэкст, жыццёвасць тэматыкі, дзейнасны кампанент, вызначэнне відаў дзейнасці, на праверку якіх скіравана заданне (той ці іншы аспект кампетэнцыі)» [5, с. 7]. Назавём некаторыя прыёмы стварэння КАЗ, праілюстраваўшы іх прыкладамі з розных этапаў рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура».

***Устанаўленне сувязі з матэрыялам іншых дысцыплін*** – першы з прыёмаў стварэння КАЗ у комплекснай рабоце па беларускай мове і літаратуры. Міждысцыплінарнасць дазваляе дасягаць метапрадметных вынікаў, якія прымяняюцца ў розных сферах дзейнасці. Найбольш натуральным з'яўляецца аб'яднанне ў адным заданні моўнага і літаратурнага матэрыялу: *Устаўце прапушчаныя назоўнікі ў фрагмент верша Людмілы Рублеўскай. Звярніце ўвагу на змешчаныя ў даведцы значэнне і характарыстыку прапушчаных слоў* [1, с. 12] – выкананне задання вымагае ад вучня прымянення як моўных (веданне лексічнага значэння слоў, іх часцінамоўнай прыналежнасці і граматычнай характарыстыкі), так і літаратурных (вызначэнне вершаванага памеру і рыфмоўкі) ведаў і навыкаў. Распаўсюджанымі алімпіяднымі заданнямі з'яўляюцца практыкаванні на пераклад, якія грунтуюцца на валоданні вучнямі некалькімі мовамі. Нярэдка ў заданнях знаходзяць адлюстраванне геаграфічныя і гістарычныя факты: *Назавіце зычны гук, які найчасцей сустракаецца ў назвах 6 абласных цэнтраў Беларусі* [1, с. 5]. Сустракаюцца і комплексныя заданні, вырашэнне якіх патрабуе актуалізацыі вучнёўскіх ведаў і навыкаў з цэлага шэрагу прадметных галін. Прыкладам можа служыць наступнае заданне [4, с. 64]: *На малюнку архітэктара і краязнаўца Анатоля Капцюга адноўлены традыцыйны сядзібны комплекс вілейскай сялянскай сям'і канца XIX – пачатку XX стагоддзя. Раскрыйце і запішыце прызначэнне названых на малюнку падсобных, гаспадарчых пабудоў і прыстасаванняў у гэтым комплексе.* Правільна выканаць заданне дапамогуць веды і навыкі, атрыманыя не толькі на ўроках мовы пры пашырэнні слоўнікавага запасу, на занятках па літаратуры пры вывучэнні твораў класічнай беларускай літаратуры або пры знаёмстве з гісторыяй побыту беларусаў у даўнейшыя часы, але і пры вывучэнні такога прадмета, як «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» (размяшчэнне будынкаў на сялянскім падворку падпарадкавана ў тым



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

ліку і патрабаванням бяспекі). Яшчэ адзін прыклад: *Устанавіце, назвы якіх месяцаў прапушчаны ў народных выслоўях (назва кожнага месяца выкарыстоўваецца 1 раз)* [1, с. 9]. Для рашэння вучэбнай задачы вучні павінны не толькі ведаць беларускія назвы месяцаў года і некаторыя сродкі моўнага афармлення фальклорных выслоўяў, але і мець уяўленне пра кліматычныя ўмовы, раслінны і жывёльны свет Беларусі, пра гаспадарчую дзейнасць беларусаў на працягу года. Паспяхова вырашыць гэту задачу вучням дапаможа матэрыял такіх вучэбных прадметаў, як «Беларуская мова», «Беларуская літаратура», «Геаграфія», «Біялогія», «Гісторыя Беларусі».

Яшчэ адным дзейсным прыёмам стварэння КАЗ з'яўляецца ***зварот да рэальнай жыццёвай сітуацыі***. Ён можа рэалізоўвацца праз падбор жыццёвай сітуацыі пад прадметную задачу: *Падарожнічаем па краіне і складаем турыстычнае выданне «Запрашаем у Беларусь!». Адрэдагуйце матэрыял для гэтага зборніка, паставіўшы словы ў дужках у патрэбнай форме* [3, с. 61] – дадзеная сітуацыя – складанне турыстычнага даведніка – дэманструе прымяненне вынікаў рашэння задачы (як правільна дапасоўваць тапонімы розных тыпаў). *Перакладзеныя на беларускую мову электронным перакладчыкам афарызмы патрабуюць дадатковага рэдагавання. Знайдзіце ў кожным з іх памылку, замяніце правільнай формай, якая адпавядае сутнасці арыгінальнага суджэння. Растлумачце прычыну памылак, якія дапускае электронны перакладчык* [2, с. 49] – зададзена рэальная сітуацыя, якая для свайго вырашэння патрабуе прадметных ведаў і ўменняў. Дапаможным сродкам стварэння/прад'яўлення жыццёвых сітуацый служыць выкарыстанне нагляднасці: *Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь выпусціў шэраг манет, прысвечаных вядомым беларускім пісьменнікам. Ніжэй падаюцца фрагменты чатырох такіх манет. Устанавіце, у чый гонар былі выпушчаны гэтыя манеты.*

КАЗ можа быць створана шляхам ***ускладнення структуры***. Найчасцей у метадычнай літаратуры аўтары звяртаюцца да наступнай структуры КАЗ: стымул → задачная фармулёўка → крыніца інфармацыі → бланк для выканання → інструмент ацэньвання. Стымул пагружае ў заданне, матывуючы на яго выкананне: *Арганізатары фестывалю беларускамоўнай рэкламы і камунікацыі AD.NAK! сцвярджаюць, што ўжыванне рэкламы па-беларуску пашырае мэтавую аўдыторыю рэкламадаўцы як мінімум на 25 %.* Пасля дадзенага стымулу прапануецца выканаць практыка арыентаваную задачу: *дапамажыце вытворцам перакласці рэкламу тавараў і іх назвы на беларускую мову* – ідзе задачная фармулёўка. Дапускаецца аб'яднанне стымулу з задачнай фармулёўкай у адным сказе: *Дапамажыце кіраўніку турыстычнага*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

*гуртка арганізаваць беларускамоўны паход і перакладзіце інструкцыю для яго ўдзельнікаў на беларускую мову* – стымулам выступае неабходнасць падрыхтоўкі беларускамоўнага мерапрыемства, пераклад з'яўляецца вучэбнай задачай. Магчымасць свабоднага выкарыстання разнастайных крыніц інфармацыі пры выкананні задання абмежавана ўмовамі правядзення алімпіяды як мерапрыемства. Аднак зварот да лексікаграфічных крыніц, да мастацкіх, навуковых, публіцыстычных твораў літаратараў, навукоўцаў, журналістаў, грамадскіх дзеячаў – неабходная ўмова стварэння кампетэнтнасна арыентаваных алімпіядных заданняў: *У «Слоўніку эпітэтаў беларускай мовы» Ніны Гаўрош да слова снег падаюцца некалькі груп эпітэтаў, якія характарызуюць: 1) колер, бляск; 2) гушчыню, хуткасць падзення; 3) уражанне, псіхалагічнае ўспрыняцце (снегу). Размяркуйце па ўказаных групах прапанаваныя эпітэты* [1, с. 13]; *Прачытайце фрагмент ліста пісьменніка Яна Скрыгана. Сярод прапанаваных сказаў адзначце тыя, што адпавядаюць пададзеным характарыстыкам* [1, с. 73]. Бланк для выканання задае ўдзельнікам алімпіяды пэўную форму прад'яўлення вынікаў: размеркаванне матэрыялу ў табліцы, суаднясенне матэрыялу калонак у тэставых заданнях закрытага тыпу, запаўненне крыжаванак і пад. Інструменты ацэньвання ў алімпіядным заданні, якое прапануецца вучням, не падаюцца, яны распрацоўваюцца для педагога – члена журы. Гэты блок уключае даведкі да задання, інфармацыю пра колькасць і размеркаванне балаў за кожны выкананы кампанент задання. Пры неабходнасці ў гэтым блоку павінна быць прадугледжана варыянтнасць адказаў.

Акрамя комплекснай работы па мове і літаратуры, яшчэ адным турам алімпіяды з'яўляецца напісанне водгуку на прапанаваны незнаёмы тэкст. Гэта заданне патрабуе ад вучняў самастойнага стварэння арыгінальнага тэксту, што дазваляе аднесці яго да кампетэнтнасна арыентаваных. Тым не менш існуе шэраг прыёмаў, закліканых стымуляваць прымяненне ўдзельнікамі алімпіяды сфарміраваных кампетэнцый: указанне на дату і/або абставіны ўзнікнення мастацкага твора, дапаўненне твора для водгуку літаратуразнаўчым каментарыем або выказваннямі аўтара/крытыка, падбор ілюстрацыі да мастацкага твора, выкарыстанне ў якасці твора для водгуку твораў пісьменнікаў-юбіляраў або пісьменнікаў-землякоў ці твораў, прысвечаных дзеячам літаратуры і мастацтва, значымым падзеям і з'явам у беларускай гісторыі і культуры.

Такім чынам, устанаўленне сувязі з матэрыялам іншых дысцыплін, зварот да рэальнай жыццёвай сітуацыі, ускладненне структуры служаць асноўнымі прыёмамі стварэння кампетэнтнасна арыентаваных заданняў пры правядзенні алімпіяды па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура». Далейшае даследаванне тэорыі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

і практыкі складання КАЗ дазволіць удасканаліць правядзенне алімпіяды як адукацыйнага мерапрыемства.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Доўгаль, Д. А.* 100 заданняў для падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры: практыкум / Д. А. Доўгаль. – Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2018. – 80 с.

2. Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры (матэрыялы для аналізу і падрыхтоўкі) / В. Л. Варановіч [і інш.] // Беларуская мова і літаратура. – 2017. – № 12 – С. 40–53.

3. Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры: трэці (абласны) этап XXXIII рэспубліканскай алімпіяды. 2016/17 навучальны год (X клас) / В. Варановіч [і інш.] // Роднае слова. – 2017. – № 3. – С. 61–64.

4. Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры: трэці (абласны) этап XXXIII рэспубліканскай алімпіяды. 2016/17 навучальны год (XI клас) / В. Варановіч [і інш.] // Роднае слова. – 2017. – № 4. – С. 63–66.

5. *Коршунова, О. В.* Компетентностно-ориентированные задания как средство достижения современных образовательных результатов / О. В. Коршунова // Научно-методический электронный журнал «Концепт». – 2016. – № 1. – С. 6–10. – Режим доступа: http://e-koncept.ru/2016/76002.htm. – Дата доступа: 12.11.2019.

6. *Фасоля, А. Н.* Компетентностно-ориентированные задачи. Проблемы терминологии, типологии и создания / А. Н. Фасоля // География. Все для учителя! – 2015. – № 11. – С. 6–9.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова